№№55—56
(2575—2576)
6 красавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

З надыходзячым Вялікаднем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Зноў арыштаваны Андрэй Клімаў

3 красавіка пракуратура Мінска прад'явіла абвінавачванне дэпутату Вярхоўнага Савета 13-га склікання Андрэю Клімаву па артыкуле 361 Крымінальнага кодэкса — заклікі да сілавога звяржэння канстытуцыйнага ладу. Палітык сам прыйшоў у пракуратуру праверыць звесткі, якія напярэдадні распаўсюдзілі незалежныя мас-медыя, пра тое, што пракуратура ўзбудзіла супраць яго крымінальную справу за паклёп на прэзідэнта. Следчы прызнаў, што мае пастанову на арышт Клімава.

Як высветлілася, крымінальная справа супраць Клімава была ўзбуджана пракуратурай Мінска яшчэ 28 лютага 2007 года па артыкуле 361, прычым "злачынствы" здзейснены Клімавым нібыта з *"з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі"*, што павялічвае тэрмін пакарання: прадугледжаная санкцыя — ад двух да пяці гадоў. Між тым "крымінальны" артыкул "Revolution forever, или Как правильно свежевать цыганского кабана в год свиньи", з-за якога, па некаторай інфармацыі, разгарэўся сыр-бор, быў надрукаваны 25 студзеня 2007 года на сайце www.ucpb.org. Інтэрнет, па беларускім заканадаўстве, сродкам масавай інфармацыі не лічыцца (пакуль што!). Так, дэпутаты рыхтуюць адпаведныя папраўкі ў закон. Але ж яшчэ не прынялі...

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька (А.Клімаў з'яўляецца сябрам АГП) заявіў, што ў тэлефоннай размове А.Клімаў паведаміў яму аб тым, што да суда ніякіх паказанняў даваць не будзе.

Дарэчы, Анатоль Лябедзька абвяргае інфармацыю пра тое, што сайт www.ucpb.org належыць АГП. *"У АГП юрыдычна няма ніякага сайта. Гэтае пытанне ўжо разглядалася нават у судзе. Ёсць сайт www.ucpb.org, які робяць прыхільнікі партыі за мяжой і да зместу якога партыя не мела ніколі ніякіх прэтэнзій. Перыядычна на сайце з'яўляюцца паведамленні прэс-службы АГП — гэта і ёсць афіцыйная пазіцыя партыі наконт унутранай і знешняй палітыкі. Ва ўсім астатнім гэта інфармацыйна-аналітычны рэсурс, цалкам незалежны і аўтаномны"*, — кажа старшыня АГП.

Пры гэтым Анатоль Лябедзька адзначае, што канкрэтную інфармацыю пра канкрэтны матэрыял (у нашым выпадку гаворка ідзе пра публікацыю "Revolution forever, или Как правильно свежевать цыганского кабана в год свиньи") можа даць чалавек, які "вывешвае" матэрыялы на сайце. *"Ён беларус, але, наколькі мне вядома, ён доўгі час у Беларусі ўжо не жыве. Па вялікім рахунку, дабрацца фізічна да яго немагчыма"*, — мяркуе палітык.

Увогуле, па перакананні Анатоля Лябедзькі, справа не ў адным-адзіным артыкуле, за які хочуць пакараць Клімава. *"Гэта нітачка, за якую ўлады ўчапіліся дзеля выбівання з працэсу актывістаў. За апошні час АГП сутыкнулася з трыма такімі выпадкамі. Дзяніс Дзянісаў сядзіць у турме — і ні адзін юрыст не можа патлумачыць, за што ён сядзіць; Крысціна Шацікава — гэта ўвогуле вяртанне да брэжнеўска-сталінскіх часоў; а цяпер і Андрэй Клімаў. Гэтыя тры чалавекі нікога і нічога не баяцца і валодаюць здольнасцю за лічаныя хвіліны мабілізаваць вакол сябе людзей. Напярэдадні — "Чарнобыльскі Шлях", таму для ўладаў пажадана было б ізаляваць таго ж Андрэя Клімава на гэты час"*, — перакананы А.Лябедзька.

Дарэчы, гэта трэцяя па ліку "палітычная" крымінальная справа ў адносінах да Андрэя Клімава і чацвёртая — па агульным ліку. Першая справа фармальна насіла эканамічны характар.

11 лютага 1998 года А.Клімаў быў арыштаваны па абвінавачваннях у незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці; больш за два гады правёў у следчым ізалятары, перш чым суд асудзіў дэпутата і бізнесмена да шасці гадоў калоніі строгага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Праваабаронцы прызналі А.Клімава вязнем сумлення. Ён быў вызвалены ўмоўна-датэрмінова 25 сакавіка 2002 года.

У 2005 годзе Андрэя Клімава абвінавачвалі ў паклёпе на прэзідэнта; крымінальная справа разглядалася ў судзе Першамайскага раёна Мінска, але тады суд вярнуў справу на дапрацоўку.

За арганізацыю Дня Волі 25 сакавіка 2005 года, так званай "беларускай рэвалюцыі", Андрэй Клімаў быў асуджаны судом Цэнтральнага раёна Мінска да паўтара гадоў абмежавання волі. Адразу ж па выхадзе А.Клімаў заявіў "Народнай волі", што застаецца ў палітыцы, будзе працаваць у якасці шэраговага сябра АГП. Вясной 2007 года планаваў выдаць кнігу ўспамінаў пад назвай "Баршчоўскі летуценнік" (Баршчоўка — гэта назва апошняй калоніі, дзе сядзеў Клімаў)...

Георгій ГЛЕБУСЬ.



Андрэй Клімаў толькі што выйшаў на волю пасля адбыцця тэрміну чарговага прысуду (Мінск, 22 снежня 2006 года). І вось зноў — за краты.

Фота bymedia.net

Крымінальны кодэкс РБ:
"Артыкул 361. Заклікі да дзеянняў, накіраваных на ўрон знешняй бяспекі Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэту, тэрытарыяльнай недатыкальнасці, нацыянальнай бяспекі і абароназдольнасці.

1.Публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады ці сілавога змянення канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, ці здрады дзяржаве, ці здзяйснення тэрарыстычнага акта ці дыверсіі, ці здзяйснення іншых дзеянняў на ўрон знешняй бяспекі Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці, нацыянальнай бяспекі і абароназдольнасці ці распаўсюджванне матэрыялаў, якія ўтрымліваюць заклікі, — караюцца арыштам на тэрмін да шасці месяцаў ці пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

2.Заклікі, звернутыя да замежнай дзяржавы, замежнай ці міжнароднай арганізацыі, здзейсніць дзеянні ва ўрон знешняй бяспекі Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэту, тэрытарыяльнай недатыкальнасці, нацыянальнай бяспекі і абароназдольнасці ці распаўсюджванне матэрыялаў, якія ўтрымліваюць такія заклікі, пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства — караюцца арыштам на тэрмін да шасці месяцаў ці пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

3.Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай ці другой гэтага артыкула, здзейсненыя з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі, — караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў".

АВАРЫІ

Латвія патрабуе з Беларусі, а Беларусь — з Расіі

Кампенсаваць наступствы аварыі на нафтаправодзе "Унеча—Вентспілс" прыйдзецца расійскаму прадпрыемству

Надзвычайнае здарэнне адбылося на Віцебшчыне яшчэ ўвечары 23 сакавіка. На нафтаправодзе "Унеча—Вентспілс", які належыць расійскаму прадпрыемству "Захад-транснафтапрадукт", лопнула труба, і каля 125 тон расійскага дызельнага паліва трапіла ў рэчку Ула, а пасля па плыні дасягнула Заходняй Дзвіны. Праз дзень нафтавыя плямы назіраліся і на паверхні латвійскай Даўгавы. Шмат шкоды аварыя прынесла глебе. Было забруджана 1,2 га зямлі, салярка ўсмакталася вельмі глыбока.

— *Зразумела, што пасля таго, як будзе праведзены канчатковы падлік і вызначана сума ўрону, рахунак будзе прадстаўлены расійскаму прыватнаму унітарнаму прадпрыемству "Захад-транснафтапрадукт"*, — кажа дырэктар Дэпартамента па геалогіі Міністэрства аховы прыроды і навакольнага асяроддзя **Уладзімір КАРПУК**. — *Гэта яго ўласнасць. Існуюць міжнародныя канвенцыі, якімі прадугледжаны механізм вяртання ўрону, які быў нанесены гаспадарцы прадпрыемствам альбо іншым суб'ектам. Застаецца толькі ацаніць гэты ўрон. Дарэчы, існуюць таксама прызнаныя сусветнай супольнасцю адмысловыя методыкі, па якіх нашы спецыялісты правядуць ацэнку ўрону і прад'явяць прэтэнзіі расіянам".*

Міністр па надзвычайных сітуацыях Беларусі Энвер Барыеў таксама пацвердзіў намер беларускага боку прад'явіць іск уладальніку нафтаправода — расійскаму прадпрыемству "Захад-транснафтапрадукт".

У сваю чаргу прэм'ер-міністр Латвіі Айгар Калвіціс заявіў журналістам, што яго краіна збіраецца падаць міжнародны іск супраць Беларусі. Латвійскі ўрад патрабуе ад беларусаў кампенсаваць выдаткі на прадухіленне экалагічнай катастрофы.

Аднак дагэтуль ні Латвія, ні Беларусь у канчатковых лічбах яшчэ не вызначыліся. Што тычыцца Беларусі, то на Віцебшчыне працягвае працаваць урадавая камісія па ліквідацыі наступстваў аварыі на нафтаправодзе і яе ацэнцы.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Адно дрэва «вырубіла» амаль палову Мінска

У мінулыя выхадныя значная частка Мінска на некалькі гадзін засталася без свету. Прычына — банальнае разгільдзяйства. Але "разбор палётаў" пачаўся сур'ёзны.

Ужо падлічана, што прамыя страты энергасістэмы ад аварыі 31 сакавіка ў Мінску склалі 5 тысяч долараў. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйнай заяве дзяржаўнага вытворчага аб'яднання "Белэнерга", размешчанай на сайце прадпрыемства.

"Наступствы аварыі вядомыя — спажыўцы засталіся без электраэнергіі на перыяд ад адной гадзіны да шасці гадзін, а агульны недаводпуск электраэнергіі або прамыя страты энергасістэмы склалі больш за 64 тыс. кВт/г. Маральны ўрон і нервовасць пры ліквідацыі нестандартнай сітуацыі, у якой былі задзейнічаны прыблізна 100 аператыўных работнікаў Мінскай энергасістэмы, ацэнцы не паддаюцца", — гаворыцца ў заяве.

"Белэнерга" паведаміла, што 31 сакавіка апоўдні раптоўна было абясточана больш за 940 катэгараваных спажыўцоў электраэнергіі Мінска. Сярод іх спажыўцы першай асаблівай катэгорыі: 1-я клінічная бальніца, помпавая станцыя "Мінсквадаканала", "Белтэлекам" (працаваў дызель-генератар), аб'екты Мінтранса, камбінат хлебапрадуктаў і інш. Часткова былі адключаны ад электраэнергіі бытавыя спажыўцы Першамайскага, Партызанскага, Заводскага, Ленінскага і Цэнтральнага раёнаў. На Мінскай ЦЭЦ-3 і Мінскай ЦЭЦ-2 узніклі парушэнні ў электрычнай частцы электрастанцый, што і выклікала такое вялікае парушэнне электразабеспячэння.

Як высветлілася, прычынай аварыйнай сітуацыі было нядбайнае стаўленне работнікаў Мінскай лесапаркавай гаспадаркі да арганізацыі і выканання работ у ахоўнай зоне ліній электрапередачы (ЛЭП). Персанал гэтай арганізацыі, нягледзячы на забарону Мінскіх электрасетак выконваць работы ў зоне ЛЭП без адпаведнай падрыхтоўкі, самавольна спілаваў дрэва вышынёй 30 м, якое ўпала на дзейнаю двухланцуговую лінію электрапередачы напружаннем 110 кВ.

"На жаль, такія інцыдэнты ў Беларускай энергасістэме не рэдкасць. У Мінску падобная сітуацыя была 12 сакавіка 2007 года, калі персанал "Гарамаўтадара" пры несанкцыянаваных раскопках пашкодзіў кабельную лінію 10 кВ і абясточыў спажыўцоў Цэнтральнага раёна Мінска. Каб пазбегнуць такіх аварый, ва ўсіх краінах свету, у тым ліку ў Беларусі, дзейнічаюць спецыяльныя нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць дзеянні энергетыкаў і іншых арганізацый пры выкананні рамонтных, будаўнічых і іншых работ у зоне дзейных ЛЭП. Ігнараванне гэтых правіл і прыводзіць да падобных наступстваў. У перыяд аварый высветлілася яшчэ адна негатыўная акалічнасць — не ўсе спажыўцы першай катэгорыі электразабеспячэння маюць рэзервовыя крыніцы сілкавання (дызельныя электрастанцыі), хаця гэта таксама прадпісана адпаведнымі нарматыўнымі актамі", — зазначаецца ў заве.

У панядзелак на традыцыйнай планёрцы ў Мінгарвыканкаме старшыня гарадской улады Міхаіл Паўлаў пасля даклада генеральнага дырэктара РУП "Мінскэнерга" Васіля Бабея проста развар'яцеўся. Адно няправільна спілаванае дрэва — і восем вырубленых падстанцый, бо сістэма не вытрымала ўзмацнення нагрузкі. Паўлаў даручыў правесці дбайнае расследаванне аварыі. Спецыяльная група ўжо пачала працаваць, і, як сцвярджаюць афіцыйныя асобы, аргвывады абавязкова будуць зроблены.

Алег СНОЎ.

ОНИ — О НАС

Ханс Герт ПЁТТЕРИНГ, глава Европарламента:

"Мы пришли к согласию, что мы в Европе. Как и народ Украины, мы заинтересованы в развитии свободной демократии и, в частности, свободы Беларуси, поддержке лидера оппозиции Милинкевича и устранении последней диктатуры в Европе."

Виктор ЯНУКОВИЧ, премьер-министр Украины:

"Сегодня процессы в Беларуси вызывают недовольство в обществе. Мы как соседи знаем, что там происходит. Хотя там наблюдается постепенный процесс демократизации страны, и делают его жители приграничных районов. Когда изменится система власти?.. Думаю, что в ближайшее время. А когда именно, мне трудно сказать, я не предсказатель".

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Пытанне Сяргею Калякіну

Мяркуючы па ўсім, падчас наступных прэзідэнцкіх выбараў Вы можаце быць у ліку прэтэндэнтаў на самую высокую пасаду. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: чаму Вас не было бачна 25 сакавіка? Вы не падзяляеце ідэі, абвешчаныя БНР?

Леанід Сцянькоў, г.Мінск.

Адказаць на пытанне нашага чытача, зададзенае праз газету, мы папрасілі самога Сяргея Калякіна:

— І Партыя камуністаў Беларуская, і я асабіста, безумоўна, падзяляем ідэалы суверэнітэту, незалежнасці, дэмакратыі. Больш за тое, менавіта за гэта мы зараз змагаемся разам з іншымі дэмакратычнымі сіламі краіны. Дэмакратыя і нейтралітэтдапамогуць нам жыць у міры і з Усходам, і з Захадам. Захоўваючы пры гэтым незалежнасць і павялічваючы дабрабыт народа.

Ігар МАРОЗАЎ.

Выказваем шчырае спачуванне супрацоўніцы офіса АБСЕ ў Мінску Фіёне ФРЭЙЗЕР у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю **БАЦЬКІ**.

Г.СІЎЧЫК,
Т.ЛЕАНОВІЧ-КЛІМАВА, Т.СЕВЯРЫНЕЦ, В.ДАШКЕВІЧ,
Я.АСТРЭЙКА, Т.КАСПЯРОВІЧ і іншыя.

Праграма Ph.D. in Economics (кандыдат эканамічных навук) у CERGE-EI

Знаходзіцца ў Празе | Акрэдытаваная ў ЗША

CERGE-EI, сумесная праграма Карлава Універсітэта (Прага) і Акадэміі Навук Чэскай Рэспублікі, запрашае зацікаўленых студэнтаў і выпускнікоў беларускіх ВНУ, якія хочуць атрымаць ступень кандыдата эканамічных навук (Ph.D. in Economics), падаць заяву аб прыёме.

- Навучальная праграма сусветнага ўзроўню ў галіне эканомікі, поўнасцю акрэдытаваная ў Чэхіі і ЗША,
- Шматнацыянальная супольнасць – выкладчыкі і студэнты з больш чым 30 краінаў Свету,
- Усё навучанне на англійскай мове,
- Прымаюцца студэнты з адукацыяй у любой галіне, але папярэдні вопыт вывучэння эканамічных навук і вышэйшай матэматыкі карысны,
- Амаль усе студэнты вызваленыя ад платы за навучанне і атрымліваюць стыпендыю,
- Большасць студэнтаў CERGE-EI праводзіць частку сваёй вучобы за мяжой,
- Нашыя выпускнікі працуюць на адказных пасадах у заходніх універсітэтах, міжнародных арганізацыях, цэнтральных банках, міжнародных кансалтынгавых фірмах і рэгіянальных аналітычных цэнтрах.

Дадатковую інфармацыю і бланкі заявак вы можаце знайсці на сайце www.cerge-ei.cz/phd.

CERGE-EI

Кантактная інфармацыя:
Student Affairs Office
P.O. Box 882
Politických vězňů 7
111 21 Prague 1
Czech Republic
тэлефон: (+420) 224 005 161
факс: (+420) 224 005 247
электронная пошта:
grad.stud@cerge-ei.cz

ад 25 сакавіка – новыя частоты, хвалі

06:00-08:00	7115 9635	41 м 31 м
18:00-20:00	9725 15215	31 м 19 м
20:00-22:00	7115 15215	41 м 19 м
22:00-24:00	7115 9750	41 м 31 м

612kHz/490м сярэднія хвалі

радыё свабода

Тел. (017) 266 39 52
СМС 391 22 24
svaboda@rferl.org
п/с 111, Менск, 220005, Беларусь
Vinohradska 1, Praha 11000 CZ

www.svaboda.org

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Крысціна Шацікава звярнулася ў пракуратуру

Загадчыца восьмым аддзяленнем Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы прызнала, што тры дні Крысціна Шацікава знаходзілася ў іх установе

У мінулых нумарах "Народная воля" паведамляла пра здарэнне, якое адбылося з грамадскай актывісткай Крысцінай Шацікавай. Нагадаем, што напярэдадні Дня Волі Крысціна была прымусова дастаўлена з Мінска ў Магілёў, дзе пасля допыту ў мясцовым КДБ невядомыя людзі ў цывільным сілай заштурхнулі яе ў аўтамабіль і адвезлі ў псіхіятрычную бальніцу. Там, па словах Шацікавай, ёй калолі моцнае псіхатропнае рэчыва — сібазон. Акрамя таго, дзяўчына сцвярджала, што яе прывязалі да ложка. Толькі на трэці дзень знаходжання Шацікавай у Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы, пасля таго як узрушыліся родныя, грамадскасць, журналісты, быў сабраны кансіліум у складзе шасці чалавек. Медыкі зрабілі выснову, што Шацікава абсалютна адэкватны чалавек і ніякай небяспекі для грамадства не ўяўляе.

Спроба вяртання ў Беларусь рэпрэсіўнай псіхіятрыі абурыла многіх і ўнутры краіны, і за яе межамі. Першае і галоўнае пытанне, якое ўзнікае: чыімі ж рукамі гэта спроба зроблена? Яго задавалі нам шматлікія чытачы, якія тэлефанавалі ў рэдакцыю пасля таго, як мы распавялі гісторыю, што адбылася з Крысцінай.

На дадзены момант дакладна вядома, што восьмым аддзяленнем Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы, дзе знаходзілася Крысціна Шацікава, кіруе Ала Уцёнышава. Увесь панядзелак па працоўным тэлефоне Алы Васільеўны нам адказвалі, што загадчыцы няма на месцы, маўляў, паступіла шмат новых хворых і яна на абходзе. Але ўсё ж такі мясцовым журналістам удалося вылавіць вельмі занятага доктара. Вось што яна паведаміла: *"Яна* (Шацікава. — **Аўт.**) *была дастаўлена супрацоўнікамі міліцыі. Там была заява. Заява з подпісамі, але без прозвішчаў. Але з подпісамі. Яна паступала з накіраваннем на прымусовую шпіталізацыю".*

Акрамя таго, Уцёнышава ў тым жа інтэрв'ю абвергла словы Крысціны Шацікавай наконт таго, што маладзёжную актывістку прывязвалі да ложка: *"Ніякай фіксацыі не было. Так, у яе было ўзбуджанне, нематываванае, неабгрунтаванае. Але яе ніхто не фіксаваў. Калі б была фіксацыя, сляды ад яе былі б. Як ад удаўкі сляды".*

Нагадаем, што на мінулым тыдні Крысціна Шацікава правяла ў Мінску прэс-канферэнцыю, дзе паведаміла, што па прадпісанні доктара ёй уводзілі сібазон. Ала Уцёнышава гэта пацвердзіла. *"Акрамя аднаго-адзінага сібазону, нічога яна не атрымлівала. Гэта лякарства адносіцца да групы наркатычных прэпаратаў, але не наркотык. Ён выклікае залежнасць, калі прымаць яго больш за месяц. Сібазон — гэта лёгкі транквілізатар, а не нейкі там псіхатропны забойны... Гэта не галюцынаген ні ў якім выпадку".*

Бадай самым галоўным пытаннем застаецца, хто даставіў Шацікаву ў псіхіятрычную клініку. Сама актывістка сцвярджае, што гэта зрабілі супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Але магілёўскі КДБ ад усяго адмаўляецца: быццам бы, нічога не ведаем, пасля допыту, на які была выклікана Шацікава, яе адпусцілі, і што там было далей — самі разбірайцеся. Па крайняй меры, менавіта так пракаментавала здарэнне кіраўнік цэнтра інфармацыі і грамадскіх сувязяў УКДБ па Магілёўскай вобласці Таццяна Шаўцова.

З просьбай разабрацца ў сітуацыі Крысціна Шацікава звярнулася ў Беларускі Хельсінкскі камітэт. Ад імя гэтай арганізацыі справай займаецца Андрэй Кім. Вось што ён распавёў карэспандэнту "Народнай волі": *"Пакуль інфармацыі няшмат. У Магілёўскую пракуратуру пададзена заява, у якой Шацікава падрабязна распавяла аб тым, што з ёй здарылася. Мы таксама накіравалі афіцыйны запыт на імя галоўнага ўрача псіхіятрычнай бальніцы Леаніда Несцера, у якім просім патлумачыць, на якой падставе Шацікаву ўтрымлівалі ў гэтай установе. Адказу пакуль няма. На гэты момант магу паведаміць, што з аддзялення міліцыі, куды маці Крысціны Святлана Міхайлаўна звярнулася з заявай аб знікненні дачкі, паведамілі, што справа наконт знікнення Шацікавай закрыта, бо высветлілася, што яна знаходзілася на лячэнні. А гэта азначае, што з магілёўскай клінікі якісьці адказ быць павінен. Пачакаем, што напішуць афіцыйна, а потым будзем рабіць далейшыя крокі".*

Наша газета будзе і далей сачыць за тым, як развіваюцца падзеі вакол гэтай справы.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ДА ВЕДАМА

Згодна з пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 28 мая 2003 года зацверджаны рэспубліканскі спіс наркатычных рэчываў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў, якія падлягаюць дзяржаўнаму кантролю ў Рэспубліцы Беларусь. У гэтым спісе пазначаны таксама і сібазон.

Нагадаем таксама, што ў Беларусі дзейнічае Закон "Аб псіхіятрычнай дапамозе і гарантыях правоў грамадзян пры яе аказанні".

Артыкул 13. Згода на лячэнне

Урач-псіхіятр абавязаны паведаміць грамадзяніну, які мае псіхіятрычнае расстройства (захворванне), у даступнай для яго форме і з улікам яго псіхічнага стану інфармацыю пра характар яго псіхічнага расстройства (захворвання), мэтах, метадах, уключаючы альтэрнатыўныя, і працягласць лячэння, якое рэкамендуецца, а таксама болевых адчуваннях, магчымай рызыцы, пабочных эфектах і пра чакаемыя вынікі... Лячэнне... праводзіцца пасля атрымання пісьмовай згоды грамадзяніна.

Артыкул 30. Падставы для прымусовай шпіталізацыі і лячэння ў псіхіятрычным стацыянары

Грамадзянін, які церпіць ад псіхіятрычнага расстройства (захворвання), можа быць шпіталізаваны ў псіхіятрычны стацыянар без яго згоды і без згоды ягонага афіцыйнага прадстаўніка, калі яго абследаванне і лячэнне магчымыя толькі ва ўмовах стацыянара, а псіхічнае расстройства (захворванне) абумоўлівае ягоную небяспеку для самога сябе альбо іншых людзей; ягоную бездапаможнасць, іншымі словамі — немагчымасць самастойна задаволіць асноўныя жыццёвыя патрэбы; істотную шкоду ягонаму здароўю з-за пагаршэння псіхічнага стану, калі ён будзе пакінуты без псіхіятрычнай дапамогі. Рашэнне аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзяніна прымае ўрач-псіхіятр.

Такім чынам, ні міліцыянеры, ні КДБшнікі не мелі права прымаць рашэнне аб прымусовай шпіталізацыі Шацікавай. Уся адказнасць — на ўрачах.

Дашкевіча накіравалі на лесапавал

Асуджаны лідэр незарэгістраванага "Маладога фронту" Зміцер Дашкевіч пераведзены ў другі атрад і накіраваны працаваць на лесапільны ўчастак. Пра гэта бацькі актывіста даведаліся з ягоных апошніх лістоў дамоў. Маці Вольга Дашкевіч занепакоена станам здароўя сына, паколькі цяжкую працу юнаку забаранілі дактары. Бацька актывіста Вячаслаў Дашкевіч звяртае ўвагу на тое, хто ініцыяваў перавод сына ў іншы атрад.

"Быццам бы чэкісты прачыталі ў Інтэрнеце, што яму там дужа вольна жывецца і загадалі адміністрацыі калоніі, каб яго перавялі на самую цяжкую працу. І яго перавялі. Бярвенні адкатваць ці перакатваць, не ведаю. І яшчэ піша, што ўсіх, хто яго падтрымлівае, а такіх там нямала, у ізалятар садзяць", — паведаміў бацька лідэра "Маладога фронту".

Нагадаем, што Зміцер Дашкевіч асуджаны на паўтара года за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Актывіст адбывае пакаранне ў Шклоўскай калоніі.

Навумаў будзе свяціцца ў цемры

Калі застанецца міністрам

Неўзабаве ў форму вопраткі супрацоўнікаў беларускай міліцыі будзе занесены шэраг змен. Пра гэта паведаміў журналістам міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў.

У прыватнасці, ён сказаў, што некалькі зменіцца колер формы, а самае галоўнае — яна будзе мець святлоадбівальныя элементы. Звязана гэта найперш з неабходнасцю гарантаваць бяспеку супрацоўнікаў. Праца па распаўсюджванні такіх элементаў праводзіцца і сярод насельніцтва. *"Міністр унутраных спраў таксама будзе насіць форму са святлоадбівальнымі элементамі",* — дадаў Уладзімір Навумаў.

Ул.інф.

ОТДЫХ-2007

По карману ли нам Красная поляна?

Любой желающий белорус за 200 долларов в сутки может отдохуть в Красной поляне в номере, где почивал Александр Лукашенко.

10 марта в Красной поляне был торжественно открыт белорусский горнолыжный комплекс "Беларусь". "Запуск" базы проходил с помпой — сообщалось, что вместе с Александром Лукашенко в Сочи прикатили именитые спортсмены Юлия Нестеренко, Алена Зубрилова, теннисный тренер Сергей Тетерин, артисты Ирина Дорофеева, Жанет, некий Шир...

Сам по себе курорт — очень заманчивое место. Еще десять лет назад Красная поляна была заброшенным поселком в горах, и участок с домиком можно было приобрести за копейки. После того как это место стало президентским курортом (российского президента), владельцы шести соток в одночасье стали миллионерами. Как некогда, в былые времена, здесь в кратчайшие сроки выстраивались охотничий дворец для царя и домики для его свиты, так буквально как грибы сейчас там повырастали дачи губернаторов, миллионеров и депутатов российской Госдумы. Одним словом, белорусы, хотя и на время в аренду, но отхватили-таки лакомый кусок.

— Комплекс уже работает, и сейчас здесь отдыхают человек тридцать, — рассказывает корреспонденту "Народной воли" директор сочинского санатория "Беларусь", в чьем подчинении находится новый комплекс, **Георгий САРАКАШИШ**. — Хотя база-то горнолыжная, сезон идет на убыль, а канатная дорога и вовсе закрылась. Но приезжают люди, сейчас вот ждем россиян и французов, которых на вершины, где есть снег, будут отправлять вертолетами.

— На сколько человек рассчитан комплекс?

— У нас 29 номеров на 70 человек. Есть номера-люкс, есть эконом-класса...

— Георгий Константинович, а Александр Лукашенко во время приезда на открытие комплекса отдыхал в сочинском санатории или остановился в Красной поляне?

— В Красной поляне, в двухместном VIP-номере улучшенной планировки. Таких, кстати, всего два номера на этаже — по 5000 российских рублей (около 200 долларов) в сутки. Мебель там получше, объем побольше. Кстати, ради Бога, если кто-то желает приехать и поселиться именно в этом номере — милости просим.

— А вообще, цены в комплексе, наверное, "кусаются"?

— Не особо. Минимальная цена у нас за номера эконом-класса — 1500 российских рублей в сутки (около 55 долларов), самые дорогие номера, как я уже говорил, — VIP-класса по 5000 рублей. В стоимость входит проживание, питание, сауна, бассейн... Кстати, одноместных номеров у нас нет, только двухместные.

— Что, кроме горных лыж, могут предложить отдыхающим в комплексе?

— Есть кабинеты для оздоровительных процедур, бассейн, тренажерный зал, сауны, кедровые бани, бильярдные, массажные кабинеты. В летний сезон можно отправиться в экстрим-туры на рафтинге, джипинг-туры, покататься на горных велосипедах, подняться пешком в горы. Есть чем занять людей.

— Какую площадь занимает "белорусский участок" Красной поляны?

— Российская сторона выделила нам два с половиной гектара земли, за полтора года здесь и отстроен комплекс.

— Строили белорусы?

— Нет, сочинская фирма.

— А дорого обошлась стройка?

— Не буду оглашать цифры, но, если брать все вместе с землей, то не дорого.

— Это место белорусами выкуплено?

— Нет, конечно. Землю, согласно Земельному кодексу, взяли в аренду на 49 лет.

— Когда можно отправиться на отдых в "белорусскую" Красную поляну?

— Да хоть прямо сейчас! При этом у нас нет никаких ограничений по дням проживания — можно день отдохнуть, а можно и десять или двадцать.

— Слышал, что в комплексе пока нет даже телефонов?

— Так там и руководства нет, поскольку база отдыха — это подразделение нашего санатория. Есть управляющий комплексом — это мой заместитель Александр Петрович Мамлай.

— Летом комплекс как будет работать?

— Планируем, что будет загружен на сто процентов и даже больше. Потому что при вместительности в 70 человек в случае чего можем принять и девяносто. Например, если приезжает семья и в двухместный номер поселяется третий человек, то ему идет скидка (детям до 15 лет — до 30 процентов, до 5 лет — 50 процентов). Кстати, все это время со дня открытия комплекс тоже работал на полную загрузку — приезжали отдыхать из России, Беларуси, дальнего зарубежья... Места здесь на самом деле красивейшие!

Из досье

Курорт "Красная поляна" находится в 45 километрах от аэропорта "Адлер" и в 70 км от центра Сочи. Красная поляна — сказочная горная страна, уникальный российский курорт на Западном Кавказе, расположенный у подножия вершин Главного Кавказского хребта, на высоте 550 м над уровнем моря. Зимой Красная поляна — отличное место для занятий горнолыжным спортом.

Алесь СИВЫЙ.

ХОРОШАЯ НОВОСТЬ

Дмитрий Рак уже ходит по палате и разговаривает по мобильному телефону

Белорусский фристайлист Дмитрий Рак получил травму головы на тренировке 10 декабря прошлого года во время этапа Кубка мира в Китае. Несколько месяцев спортсмен провел в бессознательном состоянии, но сейчас его дела идут на поправку.

...Неудачное приземление, удар головой о землю, внутричерепная гематома головного мозга, китайский госпиталь.

В конце января этого года Диму перевезли из Китая в Минск, хотя в сознание на тот момент спортсмен еще не пришел. Главный врач Республиканского центра спортивной медицины Евгений Лосицкий рассказывал тогда, что Дима ест, делает попытку что-то сказать, отвечает на пожатие руки, но не вступает в контакт с окружающими и не может фиксировать взгляд.

В Минске фристайлиста поместили в 5-ю Минскую городскую клиническую больницу в палату интенсивной терапии отделения неврологии. Сегодня можно уже с уверенностью сказать, что дела у Димы идут на поправку. На днях его посетили в больнице тренеры Василий Воробьев, Александр Пинигин, главный тренер команды Николай Козеко.

— Собрали денег, подарок купили, — рассказывает Николай Иванович. — Все у Димы

нормально, сейчас в больнице его готовят к переводу в Аксаковщину, в реабилитационный центр. Дима уже встает, хотя его правая нога немного недовыпрямляется и беспокоит. Все остальные функции в основном восстановились. Он разговаривает по мобильному телефону, сам звонит. Мы и по телефону общаемся, и в палате побеседовали, хотя, если честно, стараемся лишний раз ему не напоминать о событиях в Китае. Но разница между тем состоянием, какое было до приезда Димы в Минск, и сейчас — очень существенная.

— Разговаривает, наверное, еще медленно?

— Я к нему ездил еще перед юношеским чемпионатом, вот тогда он действительно разговаривал медленно. А сейчас говорит в нормальном темпе — как обыкновенный человек со спокойной речью.

— Покушать привезли?

— Да, соки, фрукты, нравится Диме цитрусовый гибрид помело... Ест и то, что ему в больнице готовят, и мама постоянно что-то вкусное приносит. Ест, кстати, уже абсолютно самостоятельно.

— Родители, Михаил Васильевич и Лидия Александровна, постоянно с сыном?

— Один он практически не бывает. То родители, то врачи... По их словам, кстати, спит Дима спокойно, стал более резвым. Иногда даже приходится успокаивать, когда хочет на стул сесть. Посидит на стуле, затем обратно в кровать перебирается. Конечно, мышечная масса ведь застоялась за три месяца без активных движений.

— Он уже ходит по палате?

— Да, передвигается потихонечку.

— А телевизор в палате есть?

— Нет, вместо телевизора ему поставили компьютер. Палата не особо большая, одноместная, телевизор там некуда и ставить. Плохо, правда, что солнечная сторона, потому что как ни закрывай шторы, солнце шпарит так, что невозможно дышать.

— О чем Дима расспрашивал Вас?

— О ребятах, о команде... Какие новости? Где ребята отдыхают? Обыкновенные житейские вопросы.

— Врачи ограничивают время посещения?

— Нет, особо не ограничивают, хотя родители пока не хотят, чтобы сына беспокоили журналисты. Мама Димы рассказывала, что когда к нему в гости не так давно пришли Алла Цупер из команды и жена Алексея Гришина да понатаскали подарков, так Димка так расчувствовался, что врачам пришлось вмешаться, чтобы девчонки долго не засиживались. А вообще, все у него идет к лучшему! Пускай так будет и дальше...

По сообщению информагентств, сейчас белорусский Национальный олимпийский комитет намерен развернуть активную кампанию помощи фристайлисту и уже обратился с письмом в Европейский олимпийский комитет, чтобы привлечь к ней зарубежных партнеров.

Недавно по просьбе врачей Республиканского центра спортивной медицины НОК обратился в Минздрав Беларуси с просьбой помочь в приобретении трех наименований необходимых дорогостоящих медикаментов для Дмитрия Рака и получил в этом ведомстве поддержку. Письма о помощи пострадавшему спортсмену направлены также в несколько компаний.

Алесь СИВЫЙ.

ДАТА

Аргкамітэт «Чарнобыльскага Шляху» ўзначаліў Іван Нікітчанка

Створаны аргкамітэт па правядзенні 26 красавіка ў Мінску традыцыйнай штогадовай акцыі "Чарнобыльскі Шлях". Яго ўзначаліў член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прафесар Іван Нікітчанка.

На першым пасяджэнні аргкамітэта абмяркоўваўся маршрут шэсця. Арганізатары прапаноўваюць пачаць яго ў 18.00 ад плошчы Якуба Коласа, каб затым удзельнікі шэсця прайшлі па тратуарах праспекта Незалежнасці да плошчы перад будынкам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка прапанаваў дэлегацыі аргкамітэта перад пачаткам шэсця (у 17.00) ускласці кветкі да мемарыяльнага знака каля храма абраза Божай Маці "Спатоленне загінуўшых" у Парку дружбы народаў і правесці богаслужэнне, а затым далучыцца да акцыі. На думку палітыка, тэрыторыя ў раёне храма не дазваляе правесці паўнацэнны мітынг удзельнікаў "Чарнобыльскага Шляху".

Намеснік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч выказаў упэўненасць, што па традыцыі "Чарнобыльскі Шлях", як мірная акцыя грамадзян Беларусі, пройдзе без насілля з боку дзяржаўных структур. *"Гэты шлях адрозніваецца ад мінулых новым маршрутам і задачамі. На гэты раз мы праводзім штогадовую акцыю ў сітуацыі энергетычных праблем, што насоўваюцца на краіну, і магчымай мадэрнізацыі айчыннай энергетыкі з дапамогай інвестыцый Еўрасаюза пры ўмове вызвалення палітзняволеных",* — падкрэсліў В.Івашкевіч. Паводле яго слоў, вырашэнне постчарнобыльскіх праблем магчыма толькі пры дэмакратызацыі краіны.

Марат ГАРАВЫ.

ВОЗВРАЩАЯСЬ К НАПЕЧАТАННОМУ

ТУРКИ ЛИ ВИНОВАТЫ?

Миллионы долларов «утекли» из ОАО «Ковры Бреста» и никто не ответил по закону

"Кто станет собственником ОАО "Ковры Бреста"? — так называлась статья, напечатанная в "Народной воле" 8 февраля с.г. В ней разговор шел вокруг этого важного вопроса. Подчеркивалось, что предприятие, некогда известное далеко за пределами Беларуси, на грани банкротства. И виноваты в этом, как утверждает председатель наблюдательного совета ОАО "Ковры Бреста" Тамара Карпович, турецкие производители ковров, которые, видите ли, обновили оборудование, перешли на новые технологии, что позволило снизить себестоимость и, естественно, повысить конкурентоспособность ковров на международном рынке. Мол, тяжело тягаться с такими монстрами. В некоторой степени с этим можно согласиться. Правда, возникает вопрос: почему же тогда на ОАО "Ковры Бреста" не обновили производство, не разработали новые технологии, хотя в начале 90-х годов получили на эти цели немалые кредиты по немецкой кредитной линии "Гермес"? Одни ли турки виноваты в бедах, свалившихся на предприятие?

Мне, работавшему до 2001 года старшим следователем по особо важным делам Московского РОВД г.Бреста, не раз приходилось сталкиваться с работой ОАО "Ковры Бреста". Тамара Карпович утверждает, что сложные проблемы у них возникли в 2002 году. Это действительно так, но условия для возникновения этих проблем, а это образование кредиторской задолженности в бюджет, по энергоресурсам, процентам банковских кредитов в сумме 3,4 млрд рублей, сложились раньше и способствовали этому не кто иной, как сами должностные лица ОАО "Ковры Бреста". Чтобы не быть голословным, сошлюсь на факты.

В 1988 году задолженность брестским ковровикам со стороны ТОО "М-Стиль-2" и ЗАО "Стиль" (г.Москва) составляла около 800 тысяч долларов США. Казалось бы, остановите отгрузку, потребуйте полного расчета. Но... Производится без предоплаты очередная поставка ковровых изделий, и кредиторская задолженность достигает 1,5 млн долларов США. Отпускалась продукция, понятно, не без согласия начальника отдела маркетинга и внешнеэкономических связей А.Н.Ставенко. Судя по всему, реальное положение вещей не очень волновало руководство ОАО "Ковры Бреста", и задолженность была списана на убытки производства. Виновных нет, да их и не могло быть, поскольку никакого разбирательства по этому поводу не проводилось.

В августе того же 1988 года ОАО "Ковры Бреста" заключило контракт с узбеко-афганским совместным предприятием "Гарзай" на поставку ковров и ковровых изделий на сумму 250.000 долларов США (странно, Узбекистан и Афганистан всегда славились ковроткачеством!). Контракт подписал генеральный директор ОАО "Ковры Бреста" С.Х.Федорук. В октябре ОАО "Ковры Бреста" отгрузили СП "Гарзай" ковров и ковровых изделий на сумму 120.768 долларов. Как следовало из условий контракта, следующая поставка должна была состояться после оплаты предыдущей. И хотя оплата не последовала, в ноябре осуществляется поставка ковров еще на сумму 118.712 долларов США. Время шло, деньги за отпущенную продукцию не поступили и опять руководство ОАО "Ковры Бреста" никаких мер к взысканию ущерба в сумме 239.480 долларов США не принимает и к помощи правоохранительных органов не прибегает. Кредиторская задолженность СП "Гарзай" в сумме 239.480 долларов США списана на убытки предприятия.

Не может не вызвать удивления и возмущения отпуск без предоплаты 1247 штук ковров одной из санкт-петербургских фирм и 2000 штук ковров Щекинскому химкомбинату Тульской области на общую сумму свыше 250 тысяч долларов США. Уже на третий день после отгрузки ковров администрации предприятия стало известно, что в данном случае имеет место самое обычное хищение путем мошенничества с помощью подложных документов. Что в таких случаях должен делать руководитель, которому небезразлична судьба предприятия и акционеров? Бежать в милицию. Руководство ОАО "Ковры Бреста" так и поступило, но ровно через год после события преступления. Несмотря на упущенное время, эти преступления были раскрыты в самые кратчайшие сроки, установлены места хранения похищенного, но они к этому времени были пусты. Обратись руководство предприятия в правоохранительные органы своевременно, похищенная продукция или огромная сумма была бы возвращена и тем самым возмещен ущерб, а виновные наказаны.

При заключении контрактов с получателями ковров и ковровых изделий не только не выяснялась их платежеспособность, не проверялись юридические адреса, но даже отсутствовал контроль за исполнением условий заключенных контрактов.

Небезынтересен и тот факт, что должностными лицами не принимались меры к взысканию задолженности в судебном порядке, а если такие попытки и были, то это делалось перед самым истечением срока исковой давности и после этого списывались на убытки производства.

Перечисленные факты являются не исчерпывающими и не полными, а поэтому назвать хотя бы приблизительную сумму нанесенного ущерба действиями должностных лиц ОАО "Ковры Бреста" без проведения ревизии финансово-хозяйственной деятельности предприятия не представляется возможным, но, несомненно, он исчисляется миллионами долларов США.

В процессе расследования уголовных дел, возбужденных по фактам нарушения финансово-хозяйственной деятельности названными лицами ОАО "Ковры Бреста" в целях предотвращения наступления вредных последствий, в адрес тогдашнего председателя облисполкома В.Заломая и председателя областного КГК Синевича (впоследствии осужден к 9 годам лишения свободы за взяточничество и злоупотребление служебным положением) мною были направлены письма с информацией о сложившемся неблагоприятном положении дел в ОАО "Ковры Бреста". Я требовал оказать содействие в проведении документальной ревизии финансово-хозяйственной деятельности предприятия. Странно, но никаких мер руководством области не было предпринято. Мало того, в проведении документальной ревизии было отказано по надуманным причинам, что и явилось основанием к прекращению уголовных дел, а виновным лицам избежать уголовной ответственности. Обращение к государственным средствам массовой информации также не дало никаких результатов, так как последние подобную информацию отказались печатать.

Совершенно иной была реакция руководства области, когда в семидесятые годы с этого предприятия через воздуховоды было похищено несколько десятков ковров. Вопрос был вынесен на заседание бюро обкома партии, а там, как известно, не миловали.

Без проведения хотя бы выборочной ревизии финансово-хозяйственной деятельности предприятия невозможно объективно определить размер причиненного ущерба, исследовать причины образования задолженности, выявить в полной мере допущенные нарушения, дать юридическую оценку действиям должностных лиц предприятия. Вот почему можно смело утверждать, что приведенные факты — это не полный букет нарушений, а судя по развертывающимся событиям, надо полагать, не будут приняты меры к изучению причин сложившегося негативного положения на ОАО "Ковры Бреста". Виновные в банкротстве предприятия останутся безнаказанными, а расплачиваться за их деяния станут акционеры, вложившие в акции ОАО свои скудные сбережения.

Ни одно предприятие области, а может быть, и республики, не подвергалось столь массированной атаке различного рода жуликов и проходимцев, как ОАО "Ковры Бреста". Сюда они слетались со всех уголков бывшего необъятного Союза. В чем заключалась благодатная почва для хищений именно на этом предприятии, остается загадкой сегодняшнего дня.

P.S. *При подготовке к печати настоящего материала стало известно, что ОАО "Ковры Бреста" в 2005 году произвело без предоплаты отгрузку в адрес фирмы "Интекс" (г.Москва) ковров на сумму 40 миллионов российских рублей. Оплата до настоящего времени не произведена.*

Леонид Иосифович НАРКЕВИЧ,
следователь по особо важным делам Московского РОВД г.Бреста (до 2001 года).

Народная Воля http://www.nv-online.info
6 КРАСАВІКА 2007 г.

ЭКСПЕРТИЗА

КАРА

С введением нового Кодекса об административных правонарушениях журналистов страны ожидают новые репрессии

В свое время некоторые чиновники, курирующие в государстве деятельность средств массовой информации, стали говорить о том, что пора, мол, переходить от уговоров нарушителей законодательства о СМИ к более действенным мерам. То есть, кроме всего прочего, наказывать еще и рублем. Поскольку в огромном массиве так называемых государственных СМИ не отмечалось таких нарушителей, то изначально финансовые санкции предназначались для независимых изданий демократической направленности и, не исключено, некоторых коммерческих СМИ...

И вот 1 марта 2007 года мечты сторонников фискальных методов воспитания сбылись: в новом Кодексе об административных правонарушениях (далее — КоАП) появилась статья 22.9 "Нарушение законодательства о печати и других средствах массовой информации".

Сразу оговоримся, что в лучших традициях белорусского правотворчества последних 10—12 лет, статья эта открывает широчайший простор для расширительного толкования и соответствующего правоприменения. В части 1 этой статьи нарушение законодательства о СМИ определяется как злоупотребление свободой средств массовой информации. Санкция: штраф в размере от 20 до 50 базовых величин (от 620 тысяч до 1 млн 550 тысяч рублей). Наказать можно за что угодно, поскольку ассортимент нарушений законодательства о СМИ огромен.

Перед тем как дать правовую оценку этой статье КоАП, заглянем в Закон о печати, где имеется статья 49 "Ответственность за злоупотребление свободой массовой информации". В ней идет речь о разных видах злоупотребления свободой массовой информации. Между тем в статье 22.9 КоАП говорится о *"злоупотреблении свободой средств массовой информации"*.

На практике это может привести к тому, что формулировка в протоколе об административном правонарушении по статье 22.9 будет расходиться с положениями Закона о печати. Как будут выпутываться из этой юридической ловушки инициаторы административного производства и судьи?

Скорее всего появятся соответствующие комментарии высших судебных инстанций. Но не исключено, что судьи и сами найдут нужные формы применения законов, негласно присваивая себе функции толкования права.

Впрочем, поживем — увидим. А пока возвратимся к статье 49 Закона о печати, поскольку именно в ней определены, хотя и путем отсылочных норм, случаи злоупотребления свободой массовой информации.

Первыми под финансовые молотки могут угодить те, кто нарушил требования злополучной статьи 5 Закона о печати. Напомним, что в ней представлен полный список самых грубых нарушений законодательства о печати, начиная от совершения действий, наказываемых в уголовном порядке, и завершая распространением информации от имени политических партий, профессиональных союзов или иных общественных объединений, не прошедших в установленном порядке государственную регистрацию (перерегистрацию).

Далее идут журналисты, как злоупотребляющие своими правами (статья 39 Закона), так и не выполняющие своих обязанностей (статья 40).

Не будем забывать, что есть еще и статья 50 Закона о печати, в которой говорится об ответственности журналистов "за другие нарушения".

Что же касается статьи 22.9 КоАП, то в ней имеется часть 2, где говорится о нарушении установленного порядка рассылки обязательных бесплатных экземпляров периодических изданий, о несоблюдении порядка опубликования опровержения, а равно о распространении изданий без выходных данных. За эти, казалось бы, мелкие нарушения грозит штраф от 20 до 50 базовых величин.

Во время Недели моды состоятся показы известных коллекций дизайнеров Белорусского центра моды **Эльвиры Жвиковой, Марии Ницеви, Анастасии Бровки, Андрея Ворошкевича,** где будут проиллюстрированы основные модные тенденции будущей осени и зимы. В рамках Недели моды также состоится фестиваль молодежной моды *"Поколение Next"*.

По словам организаторов мероприятия, главная задача Недели моды — повысить престиж и конкурентоспособность национального дизайна и стать "отправной точкой" для создания молодежных брендов. Неделя моды пройдет при поддержке супруги министра иностранных дел Маргариты Мартыновой.

Марина КОКТЫШ.

Сцяг на канцэрце

Неспадзяванай патрыятычнай акцыяй адзначыўся ў Віцебску канцэрт гурта сярэднявечнай музыкі "Стары Ольса" ў абласной філармоніі.

Падчас чарговага выступлення самабытных музыкаў маладзейшыя гледачы з першага рада залы віталі ўпадабаных артыстаў разгорнутым бел-чырвона-белым сцягам, не хаваючы яго аж да завяршэння апошняй музычнай кампазіцыі.

Магчыма, прысутныя на канцэрце супрацоўнікі міліцыі і КДБ таксама адчувалі асалоду ад музыкі, бо ніхто з юнакоў-"сцяганосцаў" не быў затрыманы і нават не было спробы адняць у іх "крамольны" штандар...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЗАКУЛИСЬЕ

Какие двери выбирает Театр оперы и балета — эксклюзивные деревянные или типовые железные с решеточкой?

*Один из самых лучших строителей Беларуси гендиректор ЗАО "НПО "Эльвира" **Валерий ПОТКИН** и заместитель министра культуры **Владимир ГРИДЮШКО** устроили журналисту "Народной воли" экскурсию по Национальному большому театру оперы и балета, где с минувшего года активно ведутся работы по реконструкции.*

Скандальные двери

Напомним, что почти месяц назад председатель Комитета госконтроля **Зенон Ломать** на заседании президиума Совмина публично заявил, что дирекция строительства и реконструкции Большого театра оперы и балета Беларуси допускает *"грубейшие нарушения при реконструкции театра"*.

"Только вмешательство Госконтроля позволило сэкономить 260 тысяч евро на тендере по закупке сценического оборудования, — сказал Ломать. — *Только на одних дверях отмыто 300 тысяч долларов"*.

Кстати, в Беларуси нет фирм, которые бы занимались профессиональным сценическим оборудованием. Тендер по закупке сценооборудования выиграла немецкая фирма.

А в тендере на закупку дверей, по словам Ломатя, победила *"подставная фирма"*, которая не занимается производством.

"2 миллиарда рублей за двери перечислены по предоплате, а до дверей, ох, как далеко", — заявил Ломать, заметив, что *"эти средства фирма сразу же перевела на депозитный счет в "Приорбанке"*.

Журналист "Народной воли" своими глазами видела, что двери, о которых говорил Ломать, на третьем, четвертом и пятом этажах первого пускового комплекса театра, где размещаются административные кабинеты и репетиционные залы, уже стоят. Разработаны они по индивидуальному проекту проектным институтом. На вид — самые обычные.

"Народная воля" попросила замминистра культуры **Владимира Гридюшко** прокомментировать скандал с дверями.

— *А никакого скандала не было, нет и быть не может,* — ответил Владимир Павлович. — *Комитет государственного контроля работает в плановом порядке на этом объекте, так же, как и на многих других. Могу сказать, что у нас Дирекция по реставрации и реконструкции Театра оперы и балета работает в строгом соответствии с действующим законодательством. Люди глубоко порядочные, честные, в профессиональном отношении подготовленные отлично...*

— В этой связи будет ли Министерство культуры либо генеральный подрядчик — известная строительная фирма "Эльвира" — подавать в суд на Комитет госконтроля, который, получается, покушается на их честь и доброе имя?

— *Никто не посягал сегодня на честь и достоинство ни Дирекции, ни Министерства культуры, ни генподрядчика. По этому поводу мы никуда не собираемся подавать иски. Я еще раз повторяю: Комитет госконтроля работает в плановом порядке на этом объекте. Будут результаты проверки КГК по этому поводу — мы о них расскажем.*

— Но пока никто не наказан?

— *Нет.*

— Вы же наверняка уже изучали документы КГК...

— *Нет никаких документов еще, идет проверка. У Комитета комсомола... то есть у Комитета госконтроля как у контролирующего органа есть свои вопросы, которые они должны изучить, и затем соответствующим актом проинформировать Дирекцию строящегося объекта и Министерство культуры. Не надо делать из этого никакого ажиотажа. Ну, слишком много написала пресса, слишком много показало телевидение... Ну показали и показали...*

В неофициальных беседах некоторые чиновники Минкультуры отмечают, что фирма, о которой говорил Ломать, на рынке строительных материалов работала с 1994 года. Более того—она занималась поставками дверей на многие важные объекты, в том числе и Управления делами президента. Всю информацию о своей деятельности фирма указала в документах, представленных в тендерную комиссию. Решение о том, что двери, из-за которых разгорелся сыр-бор, будет поставлять именно эта фирма, принималось коллегиально.

По одной из версий, недовольство КГК мог вызвать тот факт, что двери якобы были выкуплены заранее по более низкой цене еще в минувшем году. А с тех пор древесина уже значительно подорожала...

Когда КГК закончит проверку на этом объекте, пока неизвестно.

Сроки разные бывают...

"Весной тут еще можно было ногу сломать, — говорит гендиректор "Эльвиры" **Валерий Поткин,** проводя экскурсию по территории. — *Здесь нет ни сантиметра земли, которого бы ни коснулась наша рука. Да и в самом здании абсолютно все нуждалось в ремонте — от потолков, которые пришли в негодность, до кирпичной кладки — ее пришлось укреплять. Сцена будет сделана под наклоном по просьбе творческих коллективов. В историческую достоверность приводятся интерьеры. Мы пытаемся сохранить все то, что было ранее создано. Наша задача — чтобы театр остался таким, какой он был, но стал еще лучше при помощи каких-то новых технологий, дополнений в интерьеры.*

Реконструкция пока идет с опережением сроков. Хотя еще некоторое время назад здесь, по сути, были только голые стены. А сегодня объем проведенных работ уже равен строительству 2,5 этажа Национальной библиотеки".

По словам замминистра культуры **Владимира Гридюшко,** существует несколько сроков проведения реконструкции Театра оперы и балета. Один — нормативный — составляет 52 месяца. Другой — директивный — всего 36 месяцев. Завершить реконструкцию театра предполагается в январе 2009 года.

В этом году планируется выйти на завершающую стадию реконструкции зрительного зала, фасада здания.

Прежде чем войти в строящееся здание театра, почти все надели каски—чтобы на голову, не дай Бог, ничего не свалилось. Через некоторые время, пройдясь по этажам стройки, журналист "Народной воли", как и отдельные чиновники, искренне пожалела, что не надела предложенные резиновые сапоги...

К слову, сам Поткин ходил по стройке в глянцевом костюме, поверх которого были надеты резиновые сапоги до колена, белоснежная фирменная спецовочка и каска. В таком "обмундировании" он появляется здесь почти каждый день.

Кабинет мастера

Предполагается, что в течение месяца труппа театра уже переселится в так называемый первый пусковой комплекс. По сравнению с тем, что было, там осталось доделать совсем немного — навесить потолки, положить плитку на пол и другое. Кстати, напольный узор на каждом этаже будет разный. Один такой узор специалисты разрабатывали и выкладывали около двух месяцев—ювелирная работа!

Кабинет худрука театра балета Валентина Елизарьева уже почти готов.

"Такого кабинета ни у кого нет", — говорит главный архитектор института "Белпроект" **Анатолий Шабалин.**

В другом конце коридора—театральное кафе и зал для приемов высоких гостей и иностранных делегаций.

"Совсем скоро здесь уже можно будет выпить шампанского", — демонстрируя залы, говорит Поткин.

«Нам песня строить и жить помогает...»

Крыша театра оперы и балета стала не круглой, а плоской.

"Само здание стало немного ниже, но сохранило первоначальный вид", — замечает Поткин.

"Смотрите, какая отсюда панорама открывается! Даже Национальная библиотека видна!" — восхищается замминистра.

"В одну из суббот мы со своим коллективом поднялись на самую верхнюю точку этой крыши, — рассказывает гендиректор "Эльвиры". — *Нас было семь человек. Мы никуда не спешили. Смотрели на Минск свысока, и так хорошо было, что решили все вместе спеть "Широким проспектом шагаю...". У меня есть видеозапись этого момента. Думаю, когда-нибудь вы ее увидите...*

Главный архитектор института "Белпроект" Анатолий Шабалин настолько был потрясен этой историей, что когда услышал ее из уст Поткина, то сразу написал песню: *"С высоты поглядеть на мгновение успеваю на город родной, в нашем деле всегда есть любовь, вдохновенье, здесь нашли мы призванье с тобой..."*

В прошлом году фирма "Эльвира" специально наняла оператора, который снимает все то, что происходит на реконструкции театра.

"Он фиксирует на камеру, как здесь все было и как стало, — поясняет Поткин. — *Уже несколько десятков, а может, и сотен километров пленки ушло... Фотографий, наверное, тысяч пять... Мы хотим сделать фильм об этой стройке..."*

Дерево Елизарьева

Об этом факте строители рассказывают с гордостью.

Слева от главного входа в театр — аллея деревьев, много лет назад посаженных в память о погибших артистах. Строители говорят, что одно из этих деревьев — самое первое — сажал хореограф Валентин Елизарьев. И - -надо же — по всем расчетам именно на месте этого уникального во всех смыслах дерева должен был стоять башенный кран! Поначалу дерево хотели срубить, но, взвесив все "за" и "против", решили оставить.

А кран переставили в другое место.

Правда, для этого пришлось пожертвовать одной из стен здания, которую уже восстановили.

Говорят, Елизарьев этим фактом был очень доволен.

Стройки есть и поважней...

Кстати, суперсовременные башенные краны, которые раньше работали на реконструкции Национального большого театра оперы и балета, срочно "эвакуировали" на другую стройку — грандиозного спортивного комплекса "Минск-арена". Театру обещали найти другие краны. Но их пока там нет. Когда появятся — толком не знает никто.

Только цифры

На реконструкцию Национального академического Большого театра оперы и балета выделено порядка 90 миллионов долларов.

Современное здание театра имеет площадь 36 тысяч квадратных метров, что на 9 тысяч больше, чем до начала реконструкции.

За время реконструкции из театра вывезли более 7 тысяч тонн мусора.

Марина КОКТЫШ.

Вот так будет выглядеть фасад театра после реконструкции.

ВІНШУЕМ!

Дзевятая Паўлінка Памазана

Днямі ў Купалаўскім тэатры прайшла цырымонія ўзнагароджання тэатральных дзеячаў "Крыштальная Паўлінка"

Мерапрыемства магло б і сарвацца, бо старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў **Аляксей Дудараў** перад пачаткам імпрэзы прызнаўся, што забыў перавесці стрэлкі гадзінніка і ледзь не спазніўся на ўрачыстасць...

А прыгажуні Святлане Зелянкоўскай "Паўлінку" чамусьці не далі...

Прыемна ўразіла, што на цырымонію прыйшоў міністр культуры **Уладзімір Мацвяйчук,** які нядаўна праігнараваў юбілей Тэатра юнага гледача. Міністр нават сказаў прамову па-беларуску, што было зусім нечаканым, і нават без паперкі. Ён павіншаваў усіх са святам і запэўніў, што *"дзяржава аказвае дапамогу тэатру, выдзяляе фінансавыя сродкі, каб падтрымаць тэатральную дзейнасць"*.

Да ведама: за мінулы год дзяржава выдзеліла на падрыхтоўку спектакляў 400 мільёнаў рублёў. У 2006 годзе ў 29 тэатрах краіны пастаўлена каля 1600 спектакляў.

Нягледзячы на тое, што міністра культуры нячаста можна сустрэць у тым жа Купалаўскім, ён прызнаўся, што яму спадабаліся леташнія тэатральныя прэм'еры — "Вечар", "Несцерка", "Прытворны хворы".

"Крыштальную Паўлінку" сёлета атрымаў народны артыст Беларусі **Арнольд Памазан.**

"За трыццаць два гады ў ролі Адольфа Быкоўскага ў мяне было вельмі многа "Паўлінак", — прызнаўся акцёр. -- *Цэлых восем! І я іх усіх кахаю! Але самая галоўная — вось гэтая, дзевятая. Цяпер яна будзе заўсёды са мной!"*

Саюз тэатральных дзеячаў Беларусі ўручыў яшчэ некалькі "крыштальных" узнагарод.

"Крыштальным анёлкам" уганараваны рэжысёр Гродзенскага тэатра лялек **Алег Жугжда** (дарэчы, нядаўна ў Купалаўскім адбылася прэм'ера пастаўленага ім спектакля "Вольга").

"Герой дня" Арнольд Памазан.

"Крыштальная зорка" дасталася актрысе, якая пакуль не атрымала ганаровага звання, — вакалістцы Дзяржаўнага музычнага тэатра **Людміле Станевіч.**

Прыз надзеі і *"Крыштальную кветку"* за яркі дэбют (роля Кацярыны ў спектаклі "Утаймаванне свавольніцы") атрымала актрыса Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М.Горкага **Веранікa Ляшкевіч.**

Аляксей Дудараў запэўніў, што ўсіх лаўрэатаў выбіралі *"справядліва і аб'ектыўна — тайным галасаваннем"*.

На ўрачыстай вечарыне ўручаліся таксама імянныя прэміі. Такое адчуванне, што беларускія акцёры і рэжысёры нячаста ўшаноўваюцца — амаль кожны, хто выходзіў на сцэну, спяшаўся прызнацца, што вельмі хвалюецца.

Акцёр Драматычнага тэатра беларускай арміі **Ігар Фільчанкоў** (*прэмія імя Ігната Буйніцкага*) нават сказаў, што для яго лепей сыграць некалькі прэм'ер, чым выйсці на сцэну за ўзнагародай.

Парадавала, што букеты, падораныя ўсім узнагароджаным, былі бела-чырвонага колеру.

Дарэчы, прэмія "Крыштальная Паўлінка" была заснавана ў 1992 годзе і першай яе атрымала слынная **Стэфанія Станюта.**

Вальжына КОРСАК.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

КИНОВЕСТИ

300 спартанцев: политика и касса

Американский фильм "300" ("300 спартанцев") Знака Снайдера шел в Минске только две недели (с 22 марта по 5 апреля) в кинотеатрах "Октябрь", "Москва", "Аврора", давая хорошие сборы. В других кинотеатрах города его не будет — такое решение приняла экспертная комиссия при Министерстве культуры.

Решение принималось при участии министра **Владимира Матвейчука**, а инцидент возник в связи с обращением иранских властей. Депутаты Иранского парламента направили письмо министру иностранных дел страны с требованием выразить протест по поводу показа антииранского голливудского фильма. Дошло указание и до Беларуси. Отсюда — компромиссное решение. Поскольку фильм был объявлен в репертуаре, его полный запрет нанес бы огромные убытки.

Как известно из российской прессы, советник президента Ирана по культуре **Джавад Шамкарди** назвал фильм актом психической войны против Тегерана и его народа, а в одной из местных газет под заголовком "Голливуд объявляет войну иранцам" гнев от имени народа выражен так: *"Они пытаются сказать людям, что Иран, который сейчас входит в ось зла, уже давно был источником зла и что предки современных иранцев — это жуткие, бессловесные убийцы-мясники, которых вы видите в фильме "300"*.

Знак Снайдер открещивается от обвинений, но, учитывая ситуацию нынешнего американо-иранского противостояния, повод для обиды можно отыскать. Действительно, персы, противостоящие горстке греков под началом царя Леонида при Фермопилах в 480 г. до н.э., изображены персонажами неприглядными. Сам же предводитель персов Ксеркс выглядит злобным молодым мужчиной с пирсингом на всех частях фейса.

Но при этом, оценивая содержательную часть фильма, следует учесть и тот факт, что картина является экранизацией давнего комикса Фрэнка Миллера, где враги изображены так, как вообще представляли азиатов.

Картина "300" производит впечатление постановочным размахом, зрелищностью, красотой тел спартанцев, а последний кадр, запечатлевший убитых героев с Леонидом в центре, похож на гигантскую фреску во славу подвига. В фильме ощутим мобилизующий воинствующий призыв: вступай в сражение — и ты победишь!

Добавлю: "300" — не для слабонервных, ибо не всякий выдержит летающие отрубленные головы и пронзенные копьями тела (жестоки, кстати, обе враждующие стороны).

История с этим фильмом в Минске показывает, что на нашей территории следует оглядываться, прежде чем закупать мировой блокбастер. Так ведь все равно не предусмотришь, откуда что выскочит. В советское время идеологическая система бдительно следила за тем, чтобы исторические конфликты стран социализма не попали в фильмы. Именно поэтому **Сергею Бондарчуку** не разрешили снимать "Тараса Бульбу" Гоголя, а белорусам — кино про Кастуся Калиновского и Тадеуша Костюшко.

Изредка попадались на том, что в какой-то стране менялась ситуация. В частности, белорусский фильм "Черное солнце" (1970 г., режиссер А.Спешнев) едва не вызвал международный скандал. Вот какую депешу с грифом "Совершенно секретно" отослал в ЦК КПСС председатель КГБ СССР **Юрий Андропов:** *"Посол Демократической Республики Конго в Москве заявил: выход на экран советского фильма "Черное солнце" может иметь далеко идущие последствия... Из разговоров с африканскими актерами, исполнявшими главные роли, известно, что фильм посвящен Патрису Лумумбе и в нем показаны президент ДРК Мобуту и другие политические деятели. Изменение фамилий героев сути дела не меняет, и если окажется, что в истории с Лумумбой как-то замешан президент, то неизбежен разрыв дипломатических отношений..."*.

Фильм "Черное солнце" действительно воссоздавал эпизоды вооруженной борьбы за власть в Конго и убийство одного из лидеров Патриса Лумумбы (в фильме Робера Мусомбе) его политическим противником Мобуту (в фильме Жака Лу).

Конфликт уладили тем, что фильм не имел широкого проката, а позже "Черное солнце" вообще исключили из списка действующего фонда.

Так что учитывай не учитывай политические реалии, все равно на что-нибудь натолкнешься: как существовала межнациональная, межрасовая, межэтническая вражда в веках, так и теперь существует. Никакие уроки истории человечеству не идут впрок.

Алла БОБКОВА,
кинокритик.

Народная воля http://www.nv-online.info
6 КРАСАВІКА 2007 г.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Эдуард ЗАНКАВЕЦ:

«Крычаць на людзей — не мой метад»

Мінскае "Дынама" стала чэмпіёнам Беларусі па хакеі. Каманда Эдуарда Занкаўца парушыла традыцыю мінскага "Юнацтва", якое дагэтуль выйграла тры чэмпіёнскія тытулы запар. У фінальнай серыі да чатырох перамог "бела-блакітныя" перамаглі землякоў з "Кераміна". Пасля перамогі ў фінале з галоўным трэнерам "Дынама" сустрэўся карэспандэнт "Народнай волі".

— Эдуард Канстанцінавіч, прыміце віншаванні з перамогай. Для Вас у якасці галоўнага трэнера гэта быў першы падобны поспех. Адзначылі яго неяк асабліва?

— Не сказаў бы. У раздзявальні пасля перамогі выпілі з хакеістамі па келіху шампанскага. А потым у больш расшыраным складзе — разам з жонкамі — вячэралі ў рэстаране "Белая вежа". Увогуле, хацелася б сказаць вялікі дзякуй нашым другім паловам. Жонкі хакеістаў і трэнераў амаль у поўным складзе наведвалі нашыя гульні. Падтрымлівалі дома. А калі добра ў сям'і, то і на працы ўсё будзе аналагічна.

— Вы ўзначалілі "Дынама" па ходзе сезона. У адстаўку быў адпраўлены замежны спецыяліст Любамір Покавіч. Казалі, што ён патрабаваў значна вышэйшую зарплату, чым атрымліваюць беларускія трэнеры... І таму ў "Дынама" паклікалі Вас. Як бы Вы пракаментавалі ўсе гэтыя падзеі?

— Адстаўка Любаміра Покавіча — пытанне не маёй кампетэнцыі, так вырашыла кіраўніцтва клуба. Калі я ўзначаліў "Дынама", была пастаўлена канкрэтная задача — дасягнуць максімальна высокага выніку. Я рады, што нашы хакеісты паказалі відовішчную гульню, якая дазволіла стаць чэмпіёнамі.

— Эдуард, а яшчэ кажуць, што калі "Дынама" саступіла ў адной з фінальных сустрэч "Кераміну", Вы ў раздзявальні ўчынілі сапраўдны разнос сваім падначаленым.

— Няпраўду кажуць. Навошта крычаць на людзей? Гэта не мае метады. Я і ў жыцці спакойны чалавек. Пасля перажэнняў стараюся неяк расслабіцца. Люблю, напрыклад, музыку паслухаць (толькі не папсу), і тэкст песні павінен несці сэнс. Я аддаю перавагу року ці шансону. Мала хто ведае, але менавіта я выбіраў кампазіцыі, якія гучалі ў Палацы спорту падчас нашых гульняў. Больш за тое, перад кожнай сустрэчай у нашай раздзявальні заўжды гучала музыка. Ёсць такія моманты, калі музыка настройвае лепш усялякіх слоў.

— На матчах фінальнай стадыі Вас можна было бачыць непаголеным. Атрымліваецца, што Вы прымхлівы чалавек?

— Калі сам гуляў, то перад нейкімі адказнымі матчамі таксама не галіўся. А ў плэй-оф апошняга чэмпіянату я проста выказваў салідарнасць з хакеістамі "Дынама". Увогуле, у хакеістаў ёсць розныя забабоны: нехта не голіцца, хтосьці апранае першым менавіта левы канёк, нехта абавязкова выходзіць на раскатку трэцім ці пятым... Калі хочаце ведаць маё асабістае стаўленне да ўсіх гэтых рэчаў, то я ў забабоны не веру. Моцнаму гэта не трэба, а слабаму — не дапаможа.

— Эдуард, калі вяртацца да фінальнай серыі, то хацелася б запытацца пра фінансавы бок... Ці праўда тое, што за перамогу ў фінале хакеістам "Дынама" абяцалі салідны грашовы дадатак да асноўнага заробку?

— Памятаеце, як у Высоцкага: "А наши ребята за ту же зарплату"?.. Па ходзе сезона за перамогу над сапернікамі хакеісты атрымлівалі прэміяльныя. У рашаючай стадыі нічога не змянілася. Ніякіх баснаслоўных прэміяльных звыш зарплаты каманда не атрымлівала.

— Нядаўна старшыня федэрацыі хакея Уладзімір Навумаў шакіраваў усіх навіной, што ніякага аб'яднання сталічных каманд у будучым сезоне не будзе. Было заяўлена, што Беларусь у расійскім першынстве будзе прадстаўляць "Дынама". Атрымліваецца, што ваша каманда будзе гуляць на два фронты?

— Яснасці ў гэтым пытанні няшмат. Скажу толькі, што "Юнацтва" і "Дынама" не знайшлі паразумення і аб'яднання не будзе. Мне даручана рыхтаваць каманду да наступнага сезона. Кіраўніцтва федэрацыі паставіла задачу: беларуская каманда павінна гуляць у расійскай Суперлізе. Мне падаецца, што ў Расіі яшчэ не да канца вызначыліся, дзе і як будзе выступаць беларуская каманда. Для таго каб выступаць у Суперлізе, трэба мець адпаведную інфраструктуру. І магчымасць. Пакуль не будзе пабудаваны комплекс "Мінск-Арэна", то аб выступленні беларускай каманды ў элітным расійскім дывізіёне размовы ісці не можа. Калі ўсё ж такі будзе вырашана, што менавіта "Дынама" будзе выступаць у Расіі, то хацелася б крыху ўзмацніць склад. Ёсць у мяне на прыкмеце спартсмены, якія маглі б гэта зрабіць. Але жадаць і мець — гэта розныя рэчы. Так што паглядзім.

— Пасля напружанага сезона вас чакае заслужаны адпачынак. Як будзеце яго праводзіць?

— Каманда і сапраўды пайшла ў адпачынак. Дарэчы, яе ўзнагароджванне адбудзецца пазней. А што да майго ўласнага адпачынку, то да яго яшчэ далёка. 5 красавіка распачынаецца збор нацыянальнай зборнай. Рыхтуемся да чэмпіянату свету. Папрацуем, а потым можна і адпачыць. Я вельмі люблю адпачываць на прыродзе. Напрыклад, рыбалку, пажадана з начоўкай. У мяне добрая кампанія сяброў — хакеісты Леанід Фацікаў, Аляксандр Аляксееў. Ёсць сябры і з "нехакейнага свету". Прычым рыбалка для мяне — гэта не спорт, я не хвалюся сваім уловам. Для мяне важна — прысутнасць побач сяброў, з якімі можна гадзінамі размаўляць аб усім. Вось з'ездзім на чэмпіянат свету, а потым і на рыбалку можна...

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

ХАКЕЙ

Беларуская дружына

Для падрыхтоўкі да майскага чэмпіянату свету галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Беларусі па хакеі Курт Фрэйзер выклікаў 30 ігракоў.

Гэта — варатары Сцяпан Гарачэўскіх ("Юнацтва", Мінск), Сяргей Шабанаў ("Металург", Новакузнецк, Расія), Андрэй Мезін ("Салават Юлаеў", Уфа, Расія);

абаронцы — Аляксандр Макрыцкі, Аляксандр Журык, Андрэй Глебаў (усе — "Дынама", Мінск), Уладзімір Світа ("Керамін", Мінск), Алег Лявонцьеў, Уладзімір Копаць, Сяргей Ярковіч ("Юнацтва"), Максім Цвяткоў ("Хімвалакно", Магілёў), Віктар Касцючонак, Уладзімір Дзянісаў (абодва — "Лада", Тальяці, Расія);

нападаючыя — Дзмітрый Дудзік, Алег Антоненка, Аляксандр Кулакоў, Яўген Курылін, Сяргей Дзямагін (усе — "Дынама", Мінск), Андрэй Міхалёў, Аляксей Страхаў (абодва — "Керамін"), Аляксей Савін, Арцём Волкаў (абодва — "Юнацтва"), Сяргей Задзялёнаў, Аляксей Угараў (абодва — "Нафтахімік", Ніжнякамск, Расія), Сяргей Кукушкін, Алег Белкін (абодва — "Лада"), Канстанцін Кальцоў, Яраслаў Чупрыс, Дзмітрый Мялешка (усе — "Салават Юлаеў"), Аляксей Калюжны ("Авангард", Омск, Расія).

Федэрацыя хакея Беларусі паведаміла, што некаторыя выкліканыя ігракі траўміраваны. Існуе рэзерв хакеістаў, якія ў выпадку неабходнасці змогуць замяніць ігракоў, якія не прыехалі.

Андрэй Касціцын, Міхаіл Грабоўскі і Руслан Салей, якія выступаюць у Паўночнай Амерыцы, таксама запрошаны на збор. Аднак паколькі іх каманды працягваюць сезон, дата прыезду хакеістаў пакуль застаецца пад пытаннем.

Збор нацыянальнай каманды пачнецца 5 красавіка на базе мінскага Палаца спорту.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

ШАШКІ

Новы майстар

Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь прысвоіла мінчаніну Віктару ШУЛЬГУ ганаровае званне нацыянальнага майстра спорту па шашачнай кампазіцыі. Разгледзьце яго твор, які ён даслаў спецыяльна для нашых чытачоў:

Белыя: е3, дамкі а5, с1 (3). **Чорныя:** b4, с3, е5, g5, h4 (5). **Выйгрыш** (два ачкі).

Адначасова эцюд з'яўляецца заданнем № 1 бліцконкурсу-53 з шасці пазіцый. Пераможцу чакае сюрпрыз.

Тэрмін для адказаў - 10 дзён (усё ж гэта бліц). Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул.Энгельса, 34-а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**

Супаставім рашэнні

Давайце іх зверым на раней змешчаных заданнях.

"Кампазіцыйная апрацоўка". Міні-конкурс-53 (М.Грушэўскі): 1. cd4 2. dc3! 3. de5 4. g:c3 5. h:d8x. 2. de5? 3. g:e1 4. h:d8 ba3! 5. df6 hg5 6. f:h4 ab2 7. hf6 bc1=.

"Баталіі ў парку" (заканчэнне партыі В.Астрынскага): 1 ... ab2 2. d:f6 3. gh4 de3 4. fe7 d:f8 5. dc3 6. h:f6 hg5! 7. f:h4 bc5x.

"З нізкі кампазіцый": №7 (М. Стэфановіч). 1. de5 2. dc3 3. ab8 4. bc7! 5. de7 6. h6:f2:a5:d2!x.

Першымі правільныя адказы даслалі: М.Лічко (в. Возера Уздзенскага раёна), А.Пярхальскі (Глыбокае), У.Голуб і В.Касцян (Мінск), І.Астапенка (Стоўбцы), М.Станько (в.Смаляніца Пружанскага раёна), Л.Жыхар (г.п.Крывічы Мядзельскага раёна), П.Чэрнак (Брэст), А.Чумакоў (Светлагорск), В.Бялоў (Магілёў), А.Перавознікаў і У.Сапяжынскі (Рагачоў), А.Янчук (Камянец), В.Гаўрыш (в.Навасёлкі-1 Пастаўскага раёна) і інш. З іх Васіль Дзялендзік (Бабруйск) вырашыў выказаць нам падзяку: "Вялікі дзякуй за прыз. Для мяне гэта стымул далейшага ўдасканалвання ў справе зразумення старажытнай гульні".

Міні-конкурс-53 выйграў Іван Працук (Паставы). Яму высылаецца прыз ад вядучага рубрыкі - кніга І. Галаўні "Корифеи русских шашек" (Новополоцк, 2004).



Чэмпіянаты, алімпіяда, кубкі

У чэмпіянаце Гомельскай вобласці вызначаліся кандыдаты ў майстры спорту Эдуард Харошын, Павел Каролік і Уладзімір Марчанка.

А ў першынстве Гомеля перамог Яўген Кандрачэнка, які набраў сто працэнтаў ачкоў (18). Другі прызёр кандыдат у майстры Ігар Далгаполаў адстаў ад чэмпіёна горада на чатыры ачкі, у яго калегі па спартыўным званні Сяргея Марчанкі - 13. Разгледзьце прыклады іх творчасці:

1. Белыя (У.Канарскі): а3, b2, с3, с5, d4, е1, е3, f2, f4, h2 (10). **Чорныя** (Я.Кандрачэнка): а5, а7, b6, b8, d8, е7, f8, g5, h4, h6 (10). 1 ... ed6! 2. c:e7 f:d6 3. de5 bc7! 4. ed2 bc5 5. cd4 ab4! 6. d:b6 c:a5! 7. e:c7 8. a:c5 9. e:c5 g:d6/e7/f8x.

2. Белыя (С.Марчанка): а3, а5, b4, с1, d2, f2, g1, g3, h2 (9). **Чорныя** (П.Каролік): b8, с5, с7, d6, е5, f4, f6, f8, h8 (9). 1 ... fg5! (у партыі было 1 ... hg7) 2. gh4? ed4! 3. h:f6 fe3! 4. d:f4 cb6! 5. a:c3 fg7 6. b:d6 g:e7/f8x. Удар "пугай"!.

У Новалукомлі адбылася Рэспубліканская спартакіяда энергетыкаў па шасці відах спорту.

Па шашках мацнейшымі былі каманды Гродзенскай, якую ўзначальваў міжнародны майстар Віктар Яфіменка, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей. У асабістым заліку першае месца прысуджана кандыдату ў майстры спорту Барысу Абрамаву (Мінск).

Інваліды па зроку таксама правялі спаборніцтвы паміж сабой. Тут першынствавала каманда Віцебскай вобласці. За яе выступалі А.Радзівіловіч, Ф.Мінін, С.Голай, В.Мініна і В.Бабанаў. Другімі фінішавалі мінчане, трэцімі - іх сапернікі з Мінскай вобласці.

Кубкі ж сталіцы ўручаны: па шашках-64 - шашачнай дружыне Мінскага трактарнага завода ў складзе В.Палянскага, С.Супрунюка, А.Парамонава і Н.Гацелюк, па шашках-100 - зборнай Мінска-1 (А.Маісееву, Т.Лебедзевай і Д.Федаровіч).

ГА "Беларуская федэрацыя шашак" аб'явіла 14-ы чэмпіянат краіны па складанні мініяцюр, праблем, эцюдаў і задач-64. Удзельнік можа прадставіць не больш за шэсць твораў у кожны раздзел, новых ці апублікаваных пасля 31 сакавіка 2005 года. Апошні дзень адпраўкі кампазіцый - 10 красавіка 2007 года. Накіроўваюцца яны на адрас: 220051, Мінск, 51, а/с 52. В.І.Шульгу. Ад яго вы можаце даведацца аб астатніх умовах першынства, які праводзіцца па Кодэксе шашачнай кампазіцыі Беларусі 2004 года., калі патэлефануеце яму ў Мінск (274-11-13).

***

Сённяшнія інфармацыі істотна дапоўнілі чэмпіён краіны па шашках-64 Яўген Кандрачэнка і экс-чэмпіён Вільям Астрынскі, старшыня Рэспубліканскай камісіі па шашачнай кампазіцыі Віктар Шульга - пастаянныя карэспандэнты нашай рубрыкі "Шашкі".

Практычныя пазіцыі

Зараз ладзіцца 41-ы чэмпіянат Беларусі па перапісцы. Наступны прыклад з яго заслугоўвае вашай увагі:

Белыя (Уладзімір Таратушкін, Мінск): а3, b2, с1, d2, d4, е1, е3, f2, f4, g1 (10). **Чорныя** (Анатоль Пярхальскі, Глыбокае): а5, b6, b8, с7, d6, d8, е7, f8, h4, h8 (10). 1 ... de5! 2. f:d6 c:a1x. Калі ж 2. d:f6 3. f:h6, дык 3 ... fg7 4. h:f8 bc5 6. f:b4 a:c1x. Удар "хук злева"!

Дзмітрый Камчыцкі з Магілёва, разбіраючы сваю партыю з Цыкуновым, убачыў эфектны ўдар "пяткай":

Белыя: а5, b2, е1, е3, g3, g5, h6 (7). **Чорныя:** а3, а7, с5, с7, е5, е7, f8 (7). Ход белых. Пашукайце за іх перавагу самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Мікалай ГЛАДКІ.

ШАХМАТЫ

Из творчества читателей
А.Азов

Белые: Крh3, Фе1, Лс1, Сb1, Ке3 (5).

Черные: Кре6, п. а3 (2).

Мат в 3 хода.

Публикуем трехходовую задачу-миниатюру нашего читателя из Гомеля Алексея Азова. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

Сюрпризы от Ланиты Стецко

Первый чемпионат Беларуси по шахматам среди женщин состоялся почти 80 лет назад в 1928 году. В нем победу одержала С.Дукер. О первой чемпионке известно крайне мало, даже имя ее история не сохранила. В газете с сообщением о турнире было написано, что чемпионкой стала комсомолка, работница минского завода "Металл". Видимо, уровень шахматисток был столь низким, что следующий женский чемпионат республики был проведен лишь через 11 (!) лет — в 1939 году. А третий чемпионат Беларуси прошел еще через 13 (!) лет — в 1952 году. В нем победу одержала первый послевоенный лидер наших женских шахмат бухгалтер из Осиповичей перворазрядница Галина Невядомская. Затем женские чемпионаты проводились с периодичностью в 2—3 года. Лишь с 1959 года чемпионку республики стали определять ежегодно. Всего же прошло 49 чемпионатов Беларуси среди женщин. Наибольших успехов в них добились минчанка, мастер спорта Галина Арчакова и гроссмейстер из Витебска Раиса Эйдельсон, которые по 8 раз становились чемпионками страны. Пять раз выигрывала титул чемпионки минчанка мастер спорта Татьяна Загорская, четыре золотые медали в активе Эльмиры Хоровец (Минск), по три высшие награды у Галины Невядомской, Киры Зворыкиной, Тамары Головей, Натальи Поповой (все из Минска). После недавно финишировавшего в Минске чемпионата страны 2007 года к ним присоединилась Анна Шаревич (Брест).

В чемпионате Беларуси 2007 года участвовало 12 спортсменок. Турнир проводился по круговой системе. Особенностью чемпионата был молодежный состав участниц, средний возраст которых не достигал 19 лет. Со старта на турнире развернулась бескомпромиссная борьба за лидерство. В первых турах отличилась международный мастер Наталья Попова, стартовавшая с четырех рядовых побед. Но в пятом туре случилась сенсация. Лидер потерпела поражение во встрече с дебютанткой, самой юной участницей 13-летней Ланитой Стецко, которая очень сильно провела партию и завершила борьбу эффектным "спертым матом". Вот как это было.

Л.Стецко — Н.Попова
Сицилианская защита

1.e4 c5 2.Kf3 Kc6 3.d4 cd 4.K:d4 e6 5.Kc3 d6 6.Cc4 Kf6 7.Ce3a6 8.Cb3 Фc7 9.Фe2 Ka5 10.o-o-o K:b3+ 11.ab Cd7 12.g4 Cc6 13.f3 Ce7 14.g5 Kd7 15.Лhg1 Фa5 16.Kpb1 Лc8 17.f4 Kc5 18.f5 K:e4 19.fe K:c3+ 20.bc o-o 21.Фg4 Лce8 22.Kf5 fe 23.Kh6+! Kph8 24.Ф:e6 Фe5 25.Фg8+!

Эффектный финал. Взятие ферзя ведет к "спертому мату": 25...Л:g8 26.Kf7x! **Черные сдались.**

После 8 туров в чемпионате было два лидера. По 6,5 очка имели гроссмейстер Анна Шаревич и международный мастер Надежда Азарова. Но тут очередь встретиться с юной Стецко пришла для Азаровой. И вновь Ланита стала автором сенсации, одержав победу над лидером. Впрочем, интрига чемпионата отнюдь не была утрачена. К заключительному туру сразу три участницы — А.Шаревич, Н.Попова и Н.Азарова — подошли с равным количеством очков — по 7,5 из 10. Все решилось на финише. Здесь успеха добилась лишь Анна Шаревич, которая обыграла минчанку Александру Худую. В то время, как ее соперницы вынуждены были терять очки. Азаровой во встрече с Еленой Мининой из Витебска пришлось удовлетвориться ничьей, а Попова и вовсе потерпела поражение от Екатерины Ковалевой (Гомель). В итоге золотую медаль чемпионки страны в третий раз завоевала брестчанка, международный гроссмейстер Анна Шаревич — 8,5. На пол-очка меньше в активе обладательницы серебряной награды Надежды Поливоды. Бронзовая медаль досталась Наталье Поповой — 7,5. На последующих местах: 4—5. молодые спортсменки Александра Худая (Минск) и Екатерина Ковалева (Гомель) — по 6,5, 6—7.серебряный призер чемпионата страны 2006 года Александра Шарова (Рогачев) и Елена Минина — по 5,5, 8.Екатерина Хомякова (Минск) — 4,5, 9.Александра Савурко (Минск) — 4 очка, 10—11.Евгения Савушкина и Ланита Стецко (обе из Минска) — по 3,5, 12.Юлия Львова (Рогачев) — 2,5.

Поединок чемпионов

Достигнута договоренность о проведении в Ереване в период с 4 по 6 мая матчевой встречи между действующим чемпионом мира российским гроссмейстером Владимиром Крамником и обладателем Кубка мира гроссмейстером Левоном Ароняном (Армения).

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Сёння зрабіў перадаплату — праз 2—3 дні атрымаеш «Народную волю»

І ўсё ж у нас шмат цікавых людзей — прамаргаюць час, а потым тэлефануюць: спазніўся з **перадаплатай**, што зрабіць, каб атрымліваць "Народную волю"?

Тлумачым: аформіць **перадаплату** можна ў любы дзень. Як толькі нам стане вядома, што Вы заплацілі грошы, праз 2—3 дні атрымаеце свежыя нумары газеты. Таму хутчэй у любы філіял "Беларусбанка" альбо на пошту.

У чарговы раз паўтараем просьбу: агітуйце за "Народную волю" блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна нават да канца паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператы ўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за тры месяцы адпаведна 28.500 і 45.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь 2007 г.				
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Чем богаты, тем и рады

На чемпионате мира по велоспорту, который прошел в Испании, лишь Наталья Цилинская отметилась попаданием на подиум.

Она стала обладательницей бронзовой медали в гите на 500 метров. В спринте восьмикратная чемпионка мира завершила борьбу на стадии четвертьфиналов. В двух заездах она проиграла англичанке Виктории Пендлтон, а в заезде за пятое-восьмое место финишировала последней. В итоге белорусская велогонщица заняла 7-е место, так как одна спортсменка на старт не вышла из-за травмы.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 4.04.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №